Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

Орган парткома, рэктарата, камітэта ЛКСМБ, прафкома і мясцкома Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя В. І. Леніна

№ 3 (281) | СУБОТА 26 студзеня 1957 г. | Цана 20 кап.

І ў час сесіі не застаецца бязлюдным мінералагічны музей універсітэта. Сюды часта наведваюцца выпускнікі геолага-геаграфічнага факультэта.

НА ЗДЫМКУ: Марыя Чаус рыхтуе матэрыялы да сваёй дыпломнай работы.

Фота Л. БОНДАРА.

ЗАЛІК ПА КОЛЬКАСНАМУ АНАЛІЗУ

На трэцім курсе хімічнага факультэта закончыліся залікі па колькаснаму хімічнаму аналізу. Падведзен першы вынік работы як студэнтаў, так і выкладчыкаў кафедры за гэты семестр.

Вынікі залікаў даюць права на вывад, што асноўная частка студэнтаў III курса з вялікай цікавасцю вывучала праграмны матэрыял па якаснаму аналізу. Таму на заліку, як і трэба было чакаць, студэнты паказалі трывалыя веды. Гэта тт. Шнып, Масалыга, Альшэўская, Белакурская і другія. Але асобныя студэнты недобрасумленна адносіліся да вучобы, выканання заданняў і іх афармлення. Так, студэнтка Вялікая з вялікімі цяжкасцямі, ды і то павярхоўна адказала на пытанне кіраўніка групы. Слаба адказвалі студэнты Астрамецкі, Ламец, Сакольчык, Сачык і другія.

У гэтым навучальным годзе на трэці курс хімфака была пераведзена група студэнтаў з геалагічнага аддзялення. Яны займаліся ў асобнай групе па некалькі зменанай праграме. Але ў іх агульная хімічная падрыхтоўка ніжэй, чым у хімікаў, таму ім трэба больш папрацаваць перад экзаменамі, якія хутка давядзецца здаваць.

Зараз кожны студэнт III курса павінен максімальна выкарыстаць свой час для таго, каб паспяхова падрыхтавацца да экзамена па такому важнаму прадмету, як колькасны аналіз.

І. М. КОНЮШКА,
дацэнт.

Дзень экзаменаў на філфаку

Нягледзячы на тое, што была нядзеля, у многіх пакоях інтэрната, дзе жывуць студэнты філалагічнага факультэта, працоўны дзень пачаўся вельмі рана. Ідзе сесія, і студэнты зранку накіроўваюцца, хто ў бібліятэку горада, хто ў чытальныя залы універсітэта, хто ідзе здаваць экзамены.

У гэты дзень на чатырох курсах філалагічнага факультэта прайшлі першыя экзамены, а на другім курсе аддзялення беларускай мовы і літаратуры студэнты здавалі залік па гісторыі КПСС. Мы наведалі некаторыя экзамены і коратка раскажам аб сваіх уражаннях.

Раніца... Яшчэ задоўга да дзевяці гадзін ажыў біялагічны корпус. Каля дзвярэй аўдыторыі № 50 група студэнтаў III курса аддзялення журналістыкі. Сёння яны здаюць экзамен па сваёй спецыяльнасці—тэорыі і практыцы совецкага і партыйнага друку. Да пачатку экзамена засталося яшчэ некалькі мінут, і студэнты цікавяцца апошнімі міжнароднымі падзеямі—аб гэтым іх будуць пытаць на экзамене.

Экзамен пачаўся. Першымі білеты бяруць Станіслаў Лепесін, Пятро Беражкоў, Ларыса Кладніцкая і Валянціна Прыбава.

— Дазвольце адказваць без падрыхтоўкі, — гаворыць Пятро Беражкоў.

За свой адказ ён заслужана атрымоўвае адзнаку «выдатна».

Другім адказаў Станіслаў Лепесін і таксама атрымаў «выдатна». У гэты дзень у першай групе было пастаўлена яшчэ дзесяць такіх адзнак. Падводзячы вынікі экзамена ўсяго курса, трэба сказаць, што з 50 здаваўшых 25 чалавек на курсе атрымалі «выдатна», 20 «добра» і толькі пяць здалі на «здавальняюча».

Адметнай рысай экзамена па тэорыі і практыцы совецкага друку ў гэтым годзе з'яўляецца тое, што да яго студэнтам патрэбна было падрыхтаваць некалькі практычных работ. Наогул на працягу ўсяго семестра ўдзялялася вялікая ўвага практычным заняткам. Будучыя журналісты арганізавалі некалькі тэматычных палос у маладзёжных газетах «Чырвоная змена» і «Знамя юности», пісалі агляды друку, прысутнічалі на судовых пасяджэннях і пісалі аб іх справаздачы. Многія студэнты надрукавалі ў рэспубліканскіх газетах многа цікавых і змястоўных матэрыялаў на самыя рознастайныя тэмы. Як актыўныя і здольныя газетныя работнікі паказалі сябе Нікалай Сакалоў, Уладзімір Скапа, Алег Сцепаненка, Таццяна Арлова, Пятро Беражкоў і многія другія. Добрыя веды выявілі яны і на экзаменах па тэарэтычнаму курсу.

...Мы на экзамене па гісторыі беларускай мовы. Здаюць яго трэцекурснікі адной з груп беларускай мовы і літаратуры. Выкладчык Леў Міхайлавіч Шакун уважліва слухае адказ Ніны Федаркевіч. Яна добра расказвае аб моўна-стылістычных пластах беларускай мовы, аб барацьбе соцыялістычнай грамадскасці за яе чысціню. Але дзяўчына прыкметна хвалюецца і гэта перашкаджае ёй сканцэнтравацца на сваім адказе. Між іншым, хвалюецца не толькі Ніна Федаркевіч—хвалююцца і Тамара Панкевіч і Рэня Шпак. Але ўсе здаюць добра. Здавальняючых адзнак няма.

Дацэнт Міхаіл Іванавіч Жыркевіч, прымаў экзамен у першай групе на IV курсе аддзялення беларускай мовы і літаратуры. У ведамасці супроць прозвішчаў Іванэ Курбекі, Зоі Барысік, Таціяны Камар стаяць выдатныя адзнакі. Добрае ўражанне пакінулі ў нас і адказы Насці Кавальчук, Лены Гільдзюк. Адчувалася, што яны выдатна ведаюць матэрыял.

Калі мы зоіраліся ісці, Міхаіл Іванавіч сказаў:

— Вы-ж яшчэ не слухалі адказы нашых лепшых студэнтаў.

Але мы і так былі задаволены.

На іншых экзаменах нам пабыць не давялося. Тыя экзамены, на якіх мы былі, паказалі, што студэнты добра падрыхтаваліся да сесіі, глыбока засвоілі матэрыял.

Ів. ШУЦІК.

Напружаным жыццем жыве універсітэт у гэтыя дні.

Пройдземся па аўдыторыях, лабараторыях, кабінетах і паглядзім, як ідзе сесія.

На першым курсе біёлага-глебавага факультэта—залік па гісторыі КПСС (фота 1). Кандыдат гістарычных навук Аляксандр Владзіміравіч Царук уважліва слухае адказ Леаніда Папковіча. Размова ідзе аб памылках народнікаў.

— Што-ж, гэтае пытанне вы ведаеце добра. А цяпер раскажыце аб II з'ездзе партыі.

Леанід задумваецца, потым павольна, нібы прыслухоўваючыся да ўласных слоў, пачынае адказваць.

Экзамены ідуць!

А ў гэты час яго аднакурснік Аляксандр Астапеня рыхтуе пытанні свайго білета. Ён сканцэнтравана схіліўся над запісамі, прыпамінаючы ўсё, што можна да іх дадаць, каб яшчэ больш паглыбіць свой адказ.

— Не трэба так хвалявацца,—гаворыць Аляксандр Владзіміравіч, ставячы залік Леаніду.

Але як-жа не хвалявацца на сваіх першых заліках, калі нават тыя, хто здае ўжо не першую і не другую сесію,—і то хвалююцца? Не можа схаваць хвалявання і Ляшкевіч Галіна, студэнтка IV курса філфака, якая здае Веры Анісімайне Захаравай залік па спецкурсу (фота 3). Галіна расказвае аб вобразах рамана М. Горкага «Маці», аб этапеі «Клім Самгін», аб літаратураведчых работах, прысвечаных творчасці вялікага пролетарскага пісьменніка.

Усё гэта Галя ведае вельмі добра. Яна дае глыбокі, змястоўны адказ на ўсе пытанні выкладчыка.

А вось у студэнтак II курса геаграфічнага факультэта Светы Шупенкі (фота 2) і Іры Яшчанкі прама ля акна «ідзе кансультацыя». Па чым? Напэўна па гісторыі КПСС. Трэба спяшацца! Ну, якія пытанні яшчэ не высветлены?

(Працяг на 2 і 3 стар.)

Складаны курс

У дырэктывах XX з'езда КПСС па шостаму пяцігадоваму плану адведзена значнае месца рашэнню рада навуковых і тэхнічных задач, звязаных з развіццём фізікі і тэхнікі поўправаднікоў. Гэта знайшло сваё адлюстраванне і ў рабоце фізіка-матэматычнага факультэта. На радзе фізічных кафедраў факультэта вядзецца навукова-даследчая работа па фізіцы поўправаднікоў, для студэнтаў электрафізічнай спецыяльнасці чытаюцца спецыяльныя курсы і праводзіцца работа ў спецыяльных практыкумах па фізіцы поўправаднікоў. Гэты курс чытаецца толькі трэці год. І кожны год пашыраецца кола пытанняў—гэтая навука развіваецца надзвычай хутка. Яна мае сваёй задачай азнаёміць студэнтаў з асноўнымі якасцямі поўправаднікоў, з фізічнымі з'явамі, якія адбываюцца з імі ў рознастайных умовах, з канструкцыяй і прынцыпамі дзеяння асноўных поўправаднікоўых прыбораў, знаходзячых сабе ўсё большае прымяненне ў розных галінах тэхнікі і маючых вялікія перспектывы ўжывання ў навейшай тэхнічнай электрыцы, кінетыцы, аўтаматыцы, авіяцыі, радыётэхніцы, медыцыне і г. д.

Трэба адзначыць, што нашы студэнты праяўляюць жывую цікавасць да гэтых пытанняў. Экзамен паказаў, што пераважная большасць студэнтаў пры падрыхтоўцы выкарыстала вялікую колькасць айчыннай і зарубежнай літаратуры, улічваючы той факт, што падручніка па фізіцы поўправаднікоў яшчэ не існуе, і падрыхтоўка праграмнага матэрыялу патрабавала самых рознастайных літаратурных крыніц. Работа над зарубежнай літаратурай была арганізавана такім чынам, што студэнты, выконваючы заданні па вывучэнню спецыяльных пытанняў, адначасова выконвалі свае абавязковыя заданні па курсах замежных моў—здавалі «тысячы».

Гэта рабіла работу па перакладах цікавай і мэтанакіраванай. Студэнты IV курса электрафізічнай спецыяльнасці паказалі добрыя веды па прачытанаму ім курсу, які патрабаваў засваення вялікага эксперыментальнага матэрыялу. Нягледзячы на павышаныя патрабаванні ў час экзамена, з 29 студэнтаў, здаўшых экзамен, 13 атрымалі «выдатна» і 14—«добра».

Будзем спадзявацца, што чацверты курс электрафізікаў пакажа і ў будучым добрыя вынікі ў даследчай рабоце.

І. НЕКРАШЭВІЧ,
дацэнт.

Некаторыя вынікі

Экзамен па астраноміі здавалі студэнты II курса аддзялення фізікі і матэматыкі. 15 студзеня экзамен трымалі студэнты першай групы фізікаў. Вынікі экзамена: адна выдатная, 18 добрых і тры здавальняючых адзнакі. Глыбокія веды паказаў студэнт Шымановіч.

18 студзеня другая група фізікаў (група дзяўчат) значна лепш здала экзамен, а іменна: 12—на «выдатна», 13—на «добра» і 2—на «здавальняюча». Асабліва трывалыя веды паказалі Шварцбург, Ціхановіч, Асіпоўская, Гладчанка і Тонкая.

Дзяўчаты-матэматыкі (трэцяя група) некалькі адсталі ад другой групы. У іх толькі чатыры выдатныя адзнакі.

17 студзеня чацвертая група матэматыкаў здавала складаны, двухсеместравы курс тэарэтычнай механікі. Вынікі экзамена: 6 выдатных, 15 добрых і 4 здавальняючых адзнакі. Вельмі змястоўнымі былі адказы студэнтаў Лыскавец, Вальрачова, Скалабан, Гдалевіч і Чумакова.

Наогул з 97 экзаменаваўшыхся 24 працэнты складаюць выдатныя адзнакі, 64—добрыя і толькі 12—здавальняючыя.

88 працэнтаў выдатных і добрых адзнак, а таксама адсутнасць нездавальняючых паказваюць, што трэці курс добра падрыхтаваўся да экзамена па гэтаму прадмету.

С. А. ПАХУТА,
дацэнт.

„ДОБРА!"

Выпускнікі філалагічнага факультэта ў гэтую сесію здавалі адзін экзамен—па гісторыі філасофіі. Радаснай і ўзрушанай прыбегла ў свой пакой Ала Агурэцкая.

— Дзяўчаткі, экзамен здадзен!—усклікнула яна.

Яўгенія Еўстратава і Каця Шулейка на мінуту адарваліся ад кніг, Ліда Гурына торапка разгарнула залікоўую кніжку сяброўкі — «чацвёрка».

— Віншую, — гаворыць Ліда, паціскаючы сяброўцы руку.

Фота М. ПІЛЬШЧЫКАВА.

Некалькі слоў АБ ЧЫТАЧАХ І КНІГАХ

ДАРАГАЯ РЭДАКЦЫЯ!

Дапамажыце нам, работнікам бібліятэкі, выхаваць у чытачоў пачуццё адказнасці за зберажэнне кніг, атрымліваемых з нашай бібліятэкі. Кніга—гэта не толькі дзяржаўная маёмасць, гэта—друг, настаўнік жыцця і адносіны да яе павінны быць чулыя, клапатлівыя.

Бібліятэчныя кнігі звычайна выдаюцца на пэўны тэрмін. Гэты тэрмін разлічаны ў залежнасці ад прызначэння кнігі. Мастацкая кніга выдаецца на два тыдні, падручнікі—на семестр, манаграфіі—на месяц. Аднак некаторыя чытачы аб гэтым забываюць.

Студэнт аддзялення журналістыкі В. Адамчык, студэнты філалагічнага факультэта В. Вінаград, К. Сідарэнка не здалі кнігі, узятыя яшчэ ў 1954-55 навучальным годзе.

Студэнты геаграфічнага факультэта Н. Мурашкіна, Ф. Манулік не здалі літаратурныя матэрыялы і кнігі узятыя ў 1954-55 навуч. годзе, а М. Буко, Н. Зайцава, А. Лазоўскі, Т. Плескач і другія—ў 1955-56 навучальным годзе.

Нягледзячы на неаднаразовае папярэджанне, да гэтага часу не вярнулі кніг у бібліятэку рад іншых студэнтаў. Сярод іх: Л. Камінская, А. Данілевіч (біёлага-глебавы факультэт), В. Карпін, Р. Лукашэвіч, Т. Фёдарава, В. Петушкоў (гістарычны факультэт), В. Бараноўскі, М. Кабанава, А. Прановіч, Л. Басякоў, В. Маева, С. Марушка, А. Нічыпаровіч, Л. Парцянка, Е. Ягелла (фізіка-матэматычны факультэт), Е. Гурыновіч, Л. Козак, Г. Ламец, О. Шырокая (хімічны факультэт), А. Засім, К. Шульгіна, А. Чудакоров, В. Мелнеўскі, В. Пірожны, Г. Гімон і другія (юрыдычны факультэт).

Не лепш абстаіць справа і з кнігамі, якія ўзяты ў чытальнай зале два і больш месяцы назад. Да гэтага часу не вярнулі кнігі ў чытальную залу Б. Матусевіч, Н. Міхалевіч, Е. Серова, Г. Харытончык (біёлага-глебавы факультэт), А. Якушаў, (геаграфічны факультэт), Л. Маліноўская (гістфак), Л. Дубініна, Р. Левіцін, І. Манак, В. Пратасеня, В. Сямёнаў, Г. Станкевіч, Г. Сцепанчук і другія (фізмат), Д. Малчанаў, Р. Рубашная, М. Стральцоў, К. Цвірко (філалагічны факультэт), Т. Леонава, Г. Бараноўская (хімфак).

За 1956 год было адпраўлена чытачам 600 папярэджанняў аб звароце кніг, на што выдаткавана 240 рублёў, затрачана шмат часу. Спісы даўжнікоў бібліятэкі былі накіраваны ў прафком, камітэт комсамола, дэканаты. І тым не менш акрамя супрацоўнікаў бібліятэкі ніхто гэтым пытаннем не займаецца.

Нам здаецца, няправільна думаць, што пытанне адносна кніг датычыцца толькі бібліятэчных работнікаў. Гэта кроўная справа ўсёй грамадскасці.

Р. ЛЮБІНА,
загадчык бібліятэкі.

АБ ТЫХ, ХТО ПСУЕ КНІГІ

Кніга—лепшы друг чалавека, крыніца ведаў, як назваў яе А. М. Горкі. Ён горача заклікаў любіць кнігу, беражліва адносіцца да яе.

Я не памылюся, калі скажу, што няма сярод нас чалавека, які-б не згадзіўся з думкай вялікага пісьменніка. Шкада толькі, што не ўсе згаджаюцца з гэтай думкай на справе.

Каб не быць голаслоўным, прывяду прыклад. Студэнт нашага курса К. Георгіеў у маёй прысутнасці выдраў некалькі лістоў з кнігі С. Айні «Бухара». Бачыце, яму патрэбны біяграфічныя звесткі аб пісьменніку! «Перапісаць?!—Навошта?—разважае ён.—Выдраў, абы шыта-крыта было». А пасля яго, маўляў, хоць трава не расці. Калі я прапанаваў Георгіеву пакласці назад гэтыя лісты, той не згадзіўся. Аднак я ўсё-такі спадзяваўся, што Георгіеў зробіць з маёй заўвагі адпаведныя вывады. На вялікі жаль, гэтага не здарылася. Ён і зараз працягвае «ўкараняць» свой «метад» псавання кніг. Днямі ён, не доўга думаючы, «для сваіх патрэб» вырваў ліст з кнігі В. І. Леніна «Государство и революция», хоць гэтая кніга, як і папярэдняя, была не яго ўласнасцю, а ўласнасцю бібліятэкі.

А хіба ў нас адзін такі Георгіеў?

Зайдзіце ў чытальную залу, бібліятэку. Спытайцеся, напрыклад, у Анны Аронаўны, як студэнты адносяцца да кніг. Замест адказу Анна Аронаўна прынясе вам чацверты том энцыклапедыі, у якім вырвана 16 старонак тэксту, падручнік Жукава «Батаніка» і яшчэ пятнаццаць—дваццаць, а то і больш экземпляраў кніг, у якіх нехапае па некалькі лістоў. А хто гэта ўсё мог зрабіць, як не нашы-ж таварышы, з якімі мы разам займаемся, вядзем спрэчкі аб культуры і паводзінах маладога чалавека?

Ці ведаюць таварышы, падобныя Георгіеву, што не яны адны ў нас ва універсітэце і што па гэтых кнігах, з якіх яны вырываюць лісты, займаюцца і будуць займацца дзесяткі, сотні студэнтаў? Можа яны не ведаюць і аб законе адказнасці чытачоў за бібліятэчныя кнігі? Тады можна напомніць ім чацверты параграф гэтага закону, у якім гаворыцца:

«...Асобы, вінаватыя ў крадзяжы кніг, наўмысным іх псаванні ці злачынна-нядбайным абыходжанні з кнігамі, прыцягваюцца да крымінальнай адказнасці і, незалежна ад гэтага, абавязаны кампенсаваць нанесеную імі бібліятэцы шкоду».

(З пастановы СНК РСФСР ад 28 снежня 1944 года «Аб адказнасці за захаванасць бібліятэчнага фонду»).

Б. МАНЦЭВІЧ,
студэнт V курса аддзялення журналістыкі.

КІРАВАЦЬ КОМСАМОЛАМ ШТОДЗЁННА

Камуністычнае выхаванне моладзі з'яўляецца адной з важнейшых задач нашай партыі і комсамола. Поспех выхаваўчай работы сярод моладзі можа быць забяспечан толькі адзінствам дзеянняў партыйнай і комсамольскай арганізацый, добра наладжаным кантактам членаў партыі з ўсімі комсамольцамі і несаюзнай моладдзю. Гэтае палажэнне асабліва важна для ВНУ, дзе комсамольскія арганізацыі з'яўляюцца адным з найбольш масавых і дзе, як паказвае вопыт, часцей за ўсё маюць месца выпадкі, калі некаторыя асобы паддаюцца варожаму ўплыву і так або інкаш садзейнічаюць распаўсюджванню гэтага ўплыву ў нашым асяроддзі.

Комсамольская арганізацыя біёлага-глебавага факультэта ўсю сваю ўвагу накіроўвае на паляпшэнне палітыка-выхаваўчай, культурна-масавай і вучэбнай работы ў студэнцкім калектыве. На факультэце праводзяцца даклады, лекцыі і гутаркі на палітычныя і агульнаграмадскія тэмы. У групах рэгулярна праходзяць палітінфармацыі, у якіх пэўны ўдзел прымаюць самі студэнты.

Значная ўвага ўдзяляецца таксама пытанням навуковай і вучэбнай работы студэнтаў. На ўсіх гэтых участках у нас маюцца пэўныя поспехі. Многіх з іх мы дабіваемся дзякуючы дапамозе, якую аказвае нам, комсамольцам, партыйная арганізацыя факультэта. Партбюро на сваіх пасяджэннях заслухоўвае планы комсамольскай работы. Члены партбюро дапамагаюць комсамольскаму актыву не толькі парадамі, але і асабістым удзелам у правядзенні тых або іншых мерапрыемстваў. Вялікую дапамогу аказвае комсамольскай арганізацыі сакратар партбюро т. Палілаў, які добра ведае студэнтаў факультэта і заўсёды ўдзельнічае ў рашэнні рознастайных практычных пытанняў грамадскага жыцця.

Аднак нельга не сказаць і аб тых недахопах, якія яшчэ маюцца ў гэтых адносінах. Перш за ўсё трэба адзначыць, што ў цесным кантакце з комсамольскім актывам працуюць у асноўным толькі члены бюро партыйнай арганізацыі. Радавыя комуністы, не гаворачы ўжо аб беспартыйных выкладчыках, далёка не ў поўную меру дапамагаюць правядзенню выхаваўчай работы сярод студэнтаў. Загадчыкі кафедр зусім адарваліся ад гэтай работы, а тыя з выкладчыкаў, якія нясуць непасрэдную адказнасць за выхаваўчую работу ў групах (А. М. Папова, В. С. Пенязь, Г. Ф. Гладкі, В. К. Гаравец і другія) адносяцца да сваіх абавязкаў фармальна. Яны ў лепшым выпадку прысутнічаюць на мерапрыемствах, праводзімых у групах, але не ўнікаюць глыбока ў жыццё і вучобу студэнтаў, мала садзейнічаюць пераадольванню цяжкасцей, з якімі апошнія сутыкаюцца. Па сутнасці адзінай справай кіраўнікоў груп у сучасны момант з'яўляецца правядзенне палітінфармацый. Аднак існуючая форма правядзення іх нікога незадавальняе. На палітінфармацыях рэдка практыкуюцца жывыя гутаркі са студэнтамі, таму інфармацыі праходзяць суха, сумна, дрэнна наведваюцца.

У цэнтры ўвагі комсамольскай арганізацыі стаіць грамадская работа ў групах. Горш усяго ў гэтых адносінах абстаіць справа на II і III курсах аддзялення біялогіі. Члены комсамольскіх бюро гэтых курсаў новыя, недастаткова вопытныя, не заўсёды могуць хутка і правільна рашаць наспеўшыя пытанні. Між тым у двух гэтых групах маецца нямала студэнтаў, якія ганьбяць свой калектыў. На II курсе такімі з'яўляюцца студэнты Івашка, Казакевіч, Пагрэбняк, на III — Сазонава, Гінтова, Гардзей, Драздоўская і другія, якія несур'ёзна адносяцца да сваіх вучэбных і грамадскіх абавязкаў. Многімі з іх ужо займаліся дэканат і комсамольская арганізацыя. Толькі кіраўнікі гэтых груп (тт. Пенязь і Гаравец) не праводзяць пакуль што сур'ёзнай выхаваўчай работы з такімі студэнтамі. А магчымасці у іх для гэтага вялікія.

На нашым факультэце партыйнай работай павінен займацца цэлы рад выкладчыкаў і аспірантаў грамадскіх кафедр (тт. Ляўко, Гарбаленя, Царук, Пузікаў, Кляўчэня і другія). Каму, як не ім, павінна належыць вядучая роля ў педагагічным выхаванні студэнтаў? Аднак за выключэннем А. І. Ляўко і часткова Царука, яны ніякай выхаваўчай работы не вядуць. Відавочна, грамадскім кафедрам і партарганізацыі універсітэта трэба сур'ёзна абмеркаваць пытанне аб абавязковым актыўным удзеле ўсіх работнікаў грамадскіх кафедр у выхаваўчай рабоце. Каму, як не ім, павінна належыць першае слова аб лепшых формах і метадах гэтай работы?

У нашай рабоце маюцца і іншыя недахопы, якія можна пераадолець толькі агульнымі намаганнямі партыйнай і комсамольскай арганізацый. Кіруючая роля партыйнай арганізацыі пры гэтым з'яўляецца залогам поспеху.

Л. СУШЧЭНЯ.

ПІСЬМО Ў РЭДАКЦЫЮ

Дапамажыце ПРЫНЯЦЬ неадкладныя МЕРЫ

Кафедра фізічнай і калоіднай хіміі атрымала пакой пад лабараторыю яшчэ ў жніўні месяцы мінулага года, бо лічба студэнтаў, якія павінны былі праходзіць у гэтым навучальным годзе практыкум на кафедры, павялічылася ў два разы.

Гэты пакой адміністрацыйна-гаспадарчая частка павінна была абсталяваць пад лабараторыю да пачатку бягучага навучальнага года. Але яна і да гэтага часу не прыведзена ў належны парадак. Цэлымі месяцамі грукаліся ў дзверы адміністрацыйна-гаспадарчай часткі супрацоўнікі кафедры, прасілі хутчэй закончыць абсталяванне лабараторыі. І адміністрацыйна-гаспадарчая частка ўрэшце-такі ўзялася за справу. Але тое, што ўжо зроблена, выклікае абурэнне.

На працягу трох месяцаў у лабараторыю не была падведзена вада, нібыта з-за адсутнасці труб. Мы звярталіся да т. Аўрукіна—начальніка аддзела забеспячэння—ён замест дзелавога адказу заўсёды паабяцаў чытаць лекцыю аб нашай планавай гаспадарцы.

Нарэшце, краны наладзілі, але як? Дастаткова паглядзець на іх, каб пераканацца ў іх непрыгоднасці. Падлога тут хістаецца, што не дазваляецца ў лабараторыі, дзе праходзяць дакладныя ўзважванні, работы з высокавакуумнымі ўстаноўкамі.

Усім вядома, што вучэбнае памяшканне павінна быць светлым. Але нам сцены пафарбавалі ў карычневы колер. Па гэтай прычыне студэнты і супрацоўнікі павінны будуць нават днём працаваць пры электрычным святле.

Просім грамадскасць прымусіць т. Бярэзіна тэрмінова выправіць указаныя недахопы, а афарбоўку зрабіць у адпаведнасці з вучэбнымі патрабаваннямі.

Г. ЛАЗЕРКА, дацэнт
Т. ТАРГОНСКАЯ,
Б. ФІЛОНАЎ, Ф. КАПУЦКІ,
Н. РАФАЛЬСКІ,
А. ГАЙДАЕВА, асістэнты,
Е. КВАЧ,
старшы лабарант.

Экзамены ідуць!

А ля дзвярэй аўдыторыі, у якой выкладчык прымае залік, стаіць вялікая чарга (фота 2). Напэўна вось тая дзяўчына, якая нецярпліва трымаеца за ручку дзвярэй, гарыць жаданнем як мага хутчэй бліснуць сваімі ведамі перад выкладчыкам. На першым плане вы бачыце спіны тых, хто трапіў у палон зусім процілеглых жаданняў. Ім-бы яшчэ дзянёк-другі на падрыхтоўку! Але нічога не зробіш—прыходзіцца давучваць на хаду. Што-ж бывае і такое.

А вось гэтая дзяўчына не выпадкова глядзіць так сканцэнтравана. Яна вырашае пытанне, якое куды важней, чым гамлетаўскае «быць або не быць». «Будзе або не будзе?»—думае студэнтка аб заліку. Не хвалюйся, дзяўчына! Калі добра рыхтавалася, то абавязкова—будзе! (фота 1).

КОМСАМОЛЬСКАЯ РАБОТА Ў ВНУ ЛЕНІНГРАДА

У снежні 1956 года мне з групай комсамольскіх работнікаў Беларусі давялося пабываць у Ленінградзе. Там я пазнаёміўся з комсамольскай работай некаторых ВНУ.

Я спынюся на тых формах работы комсамольскіх арганізацый, якія ў нас не практыкуюцца і якія, на мой погляд, можна было-б выкарыстаць у нашым універсітэце, што дапамагло-б ажывіць выхаваўчую работу.

ГАЛОЎНАЕ—ВУЧОБА

На ўсіх факультэтах ЛДУ створаны акадэмічныя камісіі з прадстаўнікоў партбюро, дэканата, комсамольскага і прафсаюзнага бюро. Гэтыя камісіі вырашаюць пытанні аб выключэнні з універсітэта, аб акадэмічнай запазычанасці, заслухоўваюць справаздачы акадэмічных сектараў курсавых арганізацый, разбіраюць скаргі на дрэннае чытанне лекцый асобнымі выкладчыкамі. Разгледзеўшы якое-небудзь з гэтых пытанняў, камісія прадстаўляе свае прапановы ў дэканат, вучэбную частку або рэктарат універсітэта. Члены гэтых камісій і комсамольскі актыў запрашаюцца на пасяджэнні кафедр, на якіх абмяркоўваюцца вучэбныя планы і праграмы. Наладжваюцца рэйды на факультэтах з мэтай праверкі, як выконваецца загад Міністра вышэйшай адукацыі «Аб недапушчэнні перагрузкі студэнтаў». Усе гэтыя мерапрыемствы праводзяцца са згоды і адобрэння рэктарата.

Заслугоўвае распаўсюджвання вопыт Ленінградскага універсітэта па правядзенню «дня палітычнай вучобы комсамольскага актывіста». Перад комсамольскімі актывістамі часта выступаюць сакратары абкома партыі і комсамола, работнікі абласного выканаўчага камітэта, лепшыя лектары, буйнейшыя вучоныя Ленінграда. Распрацавана спецыяльная тэматыка лекцый для комсамольскага актыву, якая зацвярджана парткомам. Лекцыю «Палітычны і эканамічны лад Югаславіі» прачытаў, напрыклад, прафесар, які наведаў Югаславію, лекцыю «Удасканаленне дзяржаўнага апарата пасля XX з'езда КПСС»—работнік абласнога выканаўчага камітэта і г. д.

Такую форму вучобы актыву можна і трэба ўвесці ў нашым універсітэце.

ВЫХОЎВАЦЬ СТУДЭНТАЎ У ПРАЦЫ

Комсамольскія арганізацыі Ленінградскага дзяржаўнага універсітэта імя А. А. Жданава, педагагічнага інстытута імя А. І. Герцэна, медыцынскага інстытута і многіх іншых шырока ўцягваюць студэнтаў у грамадска-карысную працу. Студэнты Ленінградскага універсітэта штогод у час летніх канікул выязджаюць у калгасы Ленінградскай вобласці, удзельнічаюць у будаўніцтве сельскіх электрастанцый, жывёлагадоўчых памяшканняў. Камітэт комсамола стварае штабы студэнцкіх атрадаў, якія ўдзельнічаюць у гэтых работах, вылучае брыгадзіраў. Усім студэнтам, удзельнічаючым ў будаўнічых работах, выдаецца пуцёўка, накшталт той, якую летам 1956 года атрымлівалі студэнты, якія ўдзельнічалі ва ўборцы ўраджаю на цалінных землях.

Рыхтуючыся да паездкі на будоўлі ў перыяд летніх канікул, факультэцкія комсамольскія арганізацыі разгортваюць агітацыйную работу, выпускаюць плакаты з заклікамі ўдзельнічаць у работах на будаўнічых пляцоўках, на відным месцы вывешваецца вялікі ліст паперы, на якім напісана: «Хто паедзе на будоўлю?» Кожны студэнт, які жадае ўдзельнічаць у будаўнічых работах, запісвае сюды сваё прозвішча. Пасля таго, калі запіс заканчваецца, фарміруюцца брыгады. У работах на будоўлі ўдзельнічаюць толькі добраахвотнікі, якіх заўсёды многа. Работа студэнцкіх будаўнічых брыгад шырока асвятляецца ў друку. Пасля работ найбольш прыкладныя студэнты ўзнагароджваюцца граматамі абкома і гаркома комсамола, а таксама путёўкамі ў дамы адпачынку.

ЛІТАРАТУРНА-ДЫСКУСІЙНЫ КЛУБ

У пединстытуце імя А. І. Герцэна мы пазнаёміліся з работай літаратурна-дыскусійнага клуба. Гэты клуб быў створаны ў інстытуце ў 1929 г. У ім перад студэнтамі выступаў В. В. Маякоўскі. З таго часу клуб рэгулярна арганізоўвае сустрэчы з пісьменнікамі, на якіх тыя расказваюць аб сваёй рабоце, аб творчых планах, аб месцы совецкай літаратуры ў жыцці грамадства і г. д. Акрамя таго ў клубе праводзіцца абмеркаванне навінак совецкай літаратуры, кінафільмаў і сцэнарыяў, праводзяцца сустрэчы з тэатральнымі калектывамі, работнікамі студыі «Ленфільм». Прадметам дыскусій у клубе з'яўляюцца таксама артыкулы па пытаннях маралі, культуры, выхавання, якія ўзнімаюцца ў друку. Нядаўна, напрыклад, вельмі цікава прайшоў дыспут па артыкулу «У абарону кахання», змешчанаму ў маладзёжнай ленінградскай газеце «Смена». Усю работу клуба арганізоўвае яго праўленне, якое састаіць з 21 чалавека і ўзначальваецца дацэнтам кафедры рускай літаратуры. У сваёй дзейнасці літаратурна-дыскусійны клуб шырока звязаны з Саюзам Совецкіх пісьменнікаў. Праўленне клуба сумесна з советам СНТ выдае машынапісны часопіс «Герцэнавец», у якім друкуюцца вершы, паэмы, нарысы, літаратурна-крытычныя артыкулы, напісаныя студэнтамі. Хацелася-б ведаць думкі студэнтаў і выкладчыкаў кафедр філфака, як яны глядзяць на ідэю арганізацыі такога клуба ў нашым універсітэце.

БОЛЬШ ГУТАРАК, ЦІКАВЫХ СУСТРЭЧ

Комсамольскія арганізацыі ленінградскіх ВНУ ўдала выкарыстоўваюць у выхаваўчай рабоце са студэнтамі слаўныя рэвалюцыйныя і працоўныя традыцыі—традыцыі гераічнай барацьбы і працоўных подзвігаў, традыцыі Комсамольска-на-Амуры і Айчыннай вайны. Перад студэнтамі з успамінамі часта выступаюць старэйшыя дзеячы Комуністычнай партыі, былыя падпольшчыкі, удзельнікі штурма Зімняга палаца, арганізатары Ленінградскага комсамола, дэлегаты I, II, III з'ездаў комсамола, старэйшыя большэвікі—рабочыя Кіраўскага завода і іншых прадпрыемстваў горада, выхаванцы А. С. Макарэнкі.

Трэба, каб і комсамольская арганізацыя нашага універсітэта выхоўвала студэнтаў на слаўных баявых і працоўных традыцыях совецкага народа, каб студэнты універсітэта не толькі памяталі, але і працягвалі гэтыя традыцыі. Камітэт комсамола думае з гэтай мэтай арганізаваць у самым пачатку другога семестра рад сустрэч з першымі комсамольцамі БДУ, з удзельнікамі рэвалюцыйнага падполля і грамадзянскай вайны.

Е. БАБОСАЎ,
сакратар камітэта ЛКСМБ

Экзамены ідуць!

А тыя, хто здаў ужо ўсе залікі, рыхтуюцца да экзаменаў. Кожны размяшчаецца там, дзе яму больш спадабаецца. Студэнтка III курса філфака Соня Абрагімовіч аблюбавала сабе куток у ленпакоі інтэрната. Тут добра, утульна—можна паспяхова працаваць над канспектамі і падручнікамі па гісторыі старажытна-рускай мовы. (фота 1).

Студэнт V курса філфака Іван Пісарэнка (фота 2 на здымку справа) здаў экзамен па гісторыі філасофіі на «выдатна». А вось яго сябра, Міхаіл Палтановіч атрымаў толькі «добра».

— Што-ж ты, дружа, падкачаў?—звяртаецца да яго Іван.—Дэкарта трэба ведаць. А ну, давай прачытаем аб ім яшчэ разок.

Тэкст О. СЦЕПАНЕНКА.
Фота М. ПІЛЬШЧЫКАВА.

ПЕДАГОГ

(НАРЫС)

(Працяг, пачатак глядзі ў № 1).

...Ішлі дні, тыдні, месяцы. І аднойчы ў халодны восеньскі вечар галодны і абадраны Карабанаў прышоў у дзіцячы дом. Родная сям'я неадступна клікала назад. І ён вярнуўся. Гутарка ў кабінеце дырэктара была кароткай, без маралі і папрокаў. У блукаючым позірку Уладзіміра педагог яскрава бачыў пакутлівыя душэўныя перажыванні. Ні аб чым не распытваючы, Захар Ошэравіч толькі стрымана сказаў:

— Ну, што-ж, малайчына, што вярнуўся. Ідзі ў сталоўку. Там табе падрыхтавалі вячэру.

З таго дня дырэктар чамусьці часцей стаў заглядваць у кавальскую майстэрню.

...Аглушаюча звонка гудзе накавальня, яркімі пырскамі разлятаюцца іскры, а молат б'е ўсё мацней і мацней.

— Яшчэ разок, яшчэ! Стоп! Досыць—камандуе каваль, і Карабанаў, апусціўшы молат, зморана выцірае з ілба пот. У тыя мінуты ён здаваўся Захару Ошэравічу асабліва прыгожым: чумазы, успацелы, са шчаслівай усмешкай працаўніка. «Заўтра ў калгасе «Перамога» трэба арганізаваць нядзельнік і адказным прызначыць Карабанава»—у думках рашае дырэктар.

На досвітку па вёсцы з песнямі ідзе калона выхаванцаў. З хат выбягае дзетвара, жанчыны, паважна выходзяць мужчыны, але на работу не ідуць. Сёння вялікае рэлігійнае свята. Старэнькі дзед Дзяніс, забыўшыся аб сваёй люльцы, сыпле пяруны і маланкі на бязбожнікаў.

— А, супастаты! Што-б вам...—тут дзед захлёбваецца і доўга не можа адкашляцца. Карабанаў ужо даўно размеркаваў усім падводы і зараз апошнім выводзіць свайго каня.

— Дзень добры, «дзіду». Што, дапамагаць прышоў?—весела звяртаецца ён да Дзяніса. Але той толькі сярдзіта папыхвае люлькай. Усміхнуўшыся, Уладзімір бярэ хамут і доўга бездапаможна круціць яго ў руках. Потым, не перавярнуўшы яго, з усяе сілы пхне хамут на галаву каня.

— Які-ж дурань так запрагае?—не стрымаўшыся крычыць дзед. Карабанаў паварачваецца і ласкава просіць:

— А ты, дзядуся, не лайся, а дапамажы лепш. Вось забі мяне пярун, не ведаю, як надзець.

Ад гэтых слоў дзедава сэрца палагоднела. Крэхчучы, ён дапамагае запрэгчы, а потым нават бяжыць дадому за церассядзёлкам.

— Ну, дзед, цяпер і ты ў пекла трапіш,—заўважае трагічным голасам Уладзімір.—Хіба ў свята хто працуе? Прапаў ты, дзядусь!

Ад нечаканасці дзед нават разгубіўся. А потым, пачухаўшы патыліцу, махнуў рукой.

— Бог-богам, але бульбу садзіць усё-роўна трэба. Вунь, якая цеплыня стаіць... Ты толькі старой не кажы.

Паваліўшыся на салому, Карабанаў доўга і громка рагоча.

Вечарам за ўмелае кіраўніцтва нядзельнікам Захар Ошэравіч аб'яўляе яму падзяку. Узрушаны поспехам, ён яшчэ больш стаў прападаць у кавальскай майстэрні. Іншы раз гэта нават трывожыла дырэктара: як-бы Уладзімір не забыўся пра вучобу. Але трывога была дарэмнай. Чацвертую чвэрць ён скончыў на «чатыры» і «пяць».

У адзін з летніх вечароў у клубе ішоў бурны агульны сход выхаванцаў. Высоўваліся кандыдатуры ўдзельнікаў экскурсіі па нашай Радзіме. Адбіралі самых лепшых. Захар Ошэравіч знешне спакойны сядзеў у баку, прыслухоўваючыся да ўзбуджанага гоману рэбят. Назвалі прозвішчы Казмірчука, Дзюбы... Але раптам з розных куткоў пасыпаліся прапановы вылучыць Карабанава. Калі пачалі галасаваць за яго, дырэктар першым падняў руку.

...Гэта было цікавае падарожжа. Старажытны Кіеў, Растоў-на Дану, маляўнічыя горы Каўказа, Варонеж, цудоўная Масква і, нарэшце, Мінск. У казачным горадзе Сочы рэбяты пабывалі ў доме-музеі Нікалая Астроўскага. Сястра пісьменніка горача і цікава расказвала аб жыцці барацьбіта-комуніста. На развітанне падарыла альбом з фотаграфіямі. Дарагі падарунак прымаў Карабанаў.

Вечарам, калі чырвонаватае сонца апускалася за вяршыні гор, ён сядзеў на беразе мора і задумёна кідаў круглыя каменчыкі ў набягаўшыя хвалі. Дзесьці за спіной ціха шапацелі кіпарысы, каля кастра рыхтавалі вячэру рэбяты, а ўперадзе, далёка-далёка ў моры, чайкаю мільгаў парус.

— Як хораша!—павярнуўшыся да Захара Ошэравіча, з захапленнем прамовіў Уладзімір. Памаўчаўшы, ён раптам задуменна дадаў:

— А ўсё-ж трапна сказаў Астроўскі, што самае дарагое — гэта жыццё!.. Та-а-к, вось калі-б я меў такую сілу волі, як ён...

— А ты не ўздыхай. Сіла волі з неба не падае. Вось пастаў перад сабой якую-небудзь мэту і абавязкова пастарайся дасягнуць яе. Дарэчы, ты ўжо даўно перарос для пятага класа. А што, калі ты зараз падрыхтуешся і, перасігнуўшы цераз пяты клас, адразу пойдзеш у шосты?

Прывабная ідэя дырэктара захапіла Карабанава. Зачыніўшыся ў працоўны пакой, ён упарта вывучаў рускую мову, арыфметыку. За дапамогай звяртаўся да Захара Ошэравіча.

«Малайчына! Упартасць і воля ў яго ёсць. Іх толькі трэба накіраваць на правільны шлях і ён горы зверне»,—радуючыся за Уладзіміра, думаў дырэктар.

Але аднойчы ён выпадкова пачуў, як Карабанаў гаварыў аб дзяўчатах. Нешта пагардлівае чулася ў яго словах. Глыбока ўсхваляваны, дырэктар доўга пераконваў і нават лаяў яго. Але праз дні два Уладзімір нечакана пры ўсіх нагрубіяніў прыбіральшчыцы. Ранейшае ўсплывала зноў.

— Відаць мараль тут не дапаможа,—даведаўшыся аб новым учынку, падумаў Захар Ошэравіч. Тут трэба было нешта іншае. І ён рашыў прымяніць так называемы метад «выбуха» Макаранкі.

На другі дзень Карабанаў стаяў у кабінеце перад дырэктарам.

— Вось трэба правесці гутарку на тэму «Цяжкае становішча жанчын у капіталістычных краінах». Лепш, чым ты, яе ніхто не правядзе. Падрыхтуй, калі ласка.

Усцешаны пахвалой, Карабанаў горача ўзяўся за справу. З газет і часопісаў выразаў многа замегак, фотаздымкаў і ўсё гэта акуратна наклеіў на стэнд. Доўга і цікава расказваў ён рэбятам аб бяспраўным становішчы жанчын у краінах капітала, прыводзіў цікавыя лічбы, прыклады.

(Працяг на 4 стар.)

Пра сесію—ні слова

Пачалася зімовая экзаменацыйная сесія. Ужо даўно студэнты здалі залікі, разлічыліся з «тысячамі», пачалі здаваць экзамены. Здаецца, іх цяпершнія справы павінны былі-б вельмі зацікавіць рэдкалегіі насценных газет. Але не! Насценныя газеты біёлага-глебавага, філалагічнага, геаграфічнага, фізіка-матэматычнага факультэтаў ніводным словам не адклікнуліся на гэтую сур'ёзную і важную ў жыцці студэнтаў падзею. Яны маўчаць.

Адна толькі газета хімічнага факультэта «Совецкі хімік» парушыла гэтае маўчанне. У ёй змешчана карэспандэнцыя комсорга I курса Н. Сакалова «Перад сесіяй». Аўтар расказвае, як рыхтуюцца да першай у сваім жыцці сесіі хімікі-першакурснікі. Ён адзначае, што цэлы рад яго таварышаў да экзаменаў падыходзяць добра падрыхтаванымі. Сярод іх М. Баркоўская, С. Дудко, Цыбулька і іншыя. Названа таксама некалькі студэнтаў, падрыхтаванасць якіх да сесіі выклікае законную трывогу.

Карэспандэнцыя Сакалова напісана добра. Але чаму ў газеце «Совецкі хімік» няма іншых матэрыялаў на гэтую тэму?

Сесія ў самым разгары. І справай гонару ўсіх насценных газет з'яўляецца зараз рэгулярнае і шырокае асвятленне на сваіх старонках ходу экзаменаў.

Г. МАЗАНІК.

РЫХТАВАЦЦА да студэнцкага свята

З 25 лютага па 5 сакавіка намечана правесці факультэцкія фестывалі, якія будуць папярэднічаць агульнаўніверсітэцкаму.

Больш двух месяцаў назад на кожным факультэце былі створаны арганізацыйныя камітэты, якія разам з комсамольскім і прафсаюзным бюро павінны адказваць за падрыхтоўку да фестывалю, пачалі працаваць гурткі мастацкай самадзейнасці.

Камітэт комсамола і прафком прадаставілі ім свабоду дзеянняў—нельга-ж скоўваць ініцыятыву! Далі парады, указанні і пажадалі добрай працы. На справе-ж, як паказаў час, атрымалася так: мы з вас многа не патрабуем (і сапраўды фестывальныя вечары, якія былі запланаваны на снежань, засталіся толькі на паперы. А калі так, то не турбуйце і вы нас—свае справы наладжвайце самі.

Інакш кажучы, камітэт комсамола і прафком не аказалі і не аказваюць зараз ніякай дапамогі факультэцкай самадзейнасці, і нават не ведаюць, дзе добра, дзе дрэнна ідуць справы.

На біёлага-глебавым факультэце вельмі многія студэнты іграюць на розных інструментах. Яны даўно мараць аб стварэнні аркестра. У блакноце культмасавіка нават з'явіўся спіс жадаючых, але... аркестра і сёння няма, бо ніхто не падтрымаў ініцыятыву студэнтаў, не вылучыў кіраўніка.

Для нармальнай работы хору, танцавальнага калектыву геаграфічнага факультэта патрэбен баян. І вось баяніст, які і так перагружан, павінен абавязкова іграць ва універсітэцкім аркестры—толькі пры такой умове можна атрымліваць баян для факультэта.

На некаторых факультэтах (напрыклад, на хімічным і біёлага-глебавым) кіраўніцтва гурткамі было даручана студэнтам музычнага вучылішча, артыстам. Як радаваліся гурткоўцы, што будуць працаваць пад кіраўніцтвам сапраўдных спецыялістаў! Але радаваліся раней часу: сарваліся дзве апошнія рэпетыцыі хору на хімічным факультэце, бо не з'явіўся кіраўнік. Уся дапамога «спецыялістаў» абмежавалася адзіным пасяджэннем, якое правёў з драмгурткоўцамі біёлага-глебавага факультэта артыст Тэатра юнага гледача Рубчынскі.

Але гэта ні ў якой меры не знімае адказнасці з факультэцкіх, комсамольскіх і прафсаюзных бюро, аргкамітэтаў.

Толькі дрэнная арганізацыя, недастатковая патрабавальнасць прывялі да таго, што біёлагі дрэнна збіраліся на рэпетыцыі хору, што на хімфаку рэгулярна працаваў толькі танцавальны калектыў. Здолелі-ж арганізаваць работу гурткоў на геолага-геаграфічным і філалагічным факультэтах (адказныя за культурна-масавую работу ад комсамольскіх бюро Вішнеўскі і Шалаева). Шырока разгарнулі падрыхтоўку да фестывалю юрысты. У іх рэпетыцыі праходзяць па тры разы ў тыдзень (на іншых факультэтах звычайна 2 разы). Гурткамі кіруюць студэнты Майсеенка, Бірукоў, Кожар. Многія нумары ўжо амаль падрыхтаваны, а п'еса «Першае спатканне» гатова да пастаноўкі. Але і ў іх не без хібаў. На факультэце быў створаны і добра зарэкамендаваў сябе музычна-эстрадны аркестр. Зараз ён спыніў работу. Бюро не мае права прайсці міма гэтага.

Алег Граковіч, член факультэцкага бюро, адказны за культмасавую работу, піша ў факультэцкай насценнай газеце аб недахопах ў падрыхтоўцы да фестывалю, аб неабходнасці настойлівай і рэгулярнай працы. Ён правільна адзначае, што для таго, каб узорна правесці фестываль, нельга спынять работы гурткоў і цяпер, у час сесіі. Рэпетыцыі не перашкодзяць здаваць добра экзамены, а, наадварот, будуць своеасаблівым карысным адпачынкам.

Між іншым, на астатніх факультэтах у адзін голас заяўляюць:

— Якія тут рэпетыцыі? Зараз сесія. Вось пасля канікул разгорнем працу.

Пасля канікул да фестывалю адзін тыдзень. Што за гэты час можна зрабіць? Самае большае—правесці генеральную рэпетыцыю, паўтарыць тое, што падрыхтавана. Але-ж за паўтара месяца «перадышкі» і тое, што падрыхтавана, забудзецца, давядзецца пачынаць усё спачатку. Тады не выратуюць ні салісты, ні дэкламатары, выступіўшыя на курсавых вечарах. Нават самыя цікавыя індывідуальныя выступленні не рашаюць справы. Галоўнае—масавасць, арганізаванасць. Чым больш новых, масавых нумароў, тым шырэй кола ўдзельнікаў, тым верагодней поспех.

Не згортваць, а ўзмацняць работу павінны гурткі мастацкай самадзейнасці на факультэтах. Бесклапотнасць і безадказнасць з боку камітэта комсамола, прафкома, факультэцкіх бюро нецярпіма. Права ўдзелу ва універсітэцкім фестывалі трэба заваяваць упартай працай.

С. ГУРЭВІЧ.

ВЕРШЫ Генадзія БУРАЎКІНА

СЯБРАМ-АДНАГОДКАМ

Смела марыць і жыць любілі мы—
І між нас не сустрэнеш кволых.
Хай не з моцнымі.—Толькі з крыламі
У жыццё мы выйшлі са школы.
На шляхах падхапілі вятры нас,
Паняслі незнаёмымі далямі—
І жыццё не з газетнай вітрыны,
А ў нялёгкай рабоце пазналі мы.
Не насілі штаны мы дудачкамі,
Нас кішэнныя грошы не ласавалі.
Не на бацьку мы ўехалі ў будучае,
А ўвайшлі нагамі ўласнымі.
І ва ўсіх чынах-поўнамоцтвах
Захаваем да снегу на скронях
Поціск рук па-працоўнаму моцны,
Бугаркі мазалёў на далонях.
Наліліся ў нас сілы сталасцю,
І наш лозунг: «Насустрач ветру!
Гэтак жыць, каб штодзень адчувалася,
Што і ты неабходны свету!»

☆ ☆ ☆

Можа, болей нам не сустрэцца
І мяне не ўзбунтуе больш,
Адваліць тая частка сэрца,
Што ў мяне паланіла ты ўсё-ж.
А пакуль-што на ўсіх раздарожжах,
Між чужых раўнадушных людзей
Буду я табе сэрца трывожыць
Успамінамі кожны дзень.
І калі пацалунак нейчы
Раптам губы твае апячэ,
Ты успомніш:
а той, ранейшы,
Цалаваў усё-ж гарачэй.
І калі табе позірк нейчы
Будзе кроў хваляваць па начах,
Зноў ты ўспомніш:
а той, ранейшы,
Больш пяшчоты меў у вачах
І быць можа, на тых раздарожжах
Зразумець ты паспееш яшчэ:
Ад мяне ўцячы ты можаш,—
Ад кахання-ж ніяк не ўцячэш!

У 1954 годзе ў часопісе «Полымя» быў апублікаван верш «Сын» Генадзія Бураўкіна.

З таго часу вершы маладога паэта сталі рэгулярна паяўляцца на старонках рэспубліканскага друку. Яны палюбіліся чытачу.

Зараз Генадзій Бураўкін займаецца на III курсе аддзялення журналістыкі. Ён поўны творчых пошукаў і новых задум.

Ніжэй мы змяшчаем новыя вершы маладога паэта.

☆ ☆ ☆

Я не магу даць ні даўгі рубель,
Ні моднага буфета пад арэх,—
Затое сэрца аддаю табе,
А ты без грошай сэрца не бярэш.
Але калі я буду праз гады
Мець і багацця атрыбуты ўсе
І ты мне сваё сэрца прынясеш,—
Я твайго сэрца не вазьму тады.

УСПАМІНЫ ДЗЯЦІНСТВА

Неяк па-даросламу, знянацку
Першым болем страсянулі нас
Развітальны пацалунак бацькі
І, як стрэл, кароткае:—Вайна!
Упаўзла яна на матацыклах,
У рацэ змывала доўга кроў,
Вісельняй і цішынёй нязвыклай
Засланіла радасць вечароў.
Адплылі і цацкі ўсе і згадкі,
Пахаваў дзед казкі за вусы.
І рабілі мы тады рагаткі,
Разбівалі вокны і насы.
Адшукаўшы у дарожным пыле
Кучу камняў, па чарзе мы ўсе
Па партрэту Гітлера лупілі,
Што на хаце старасты вісеў.
І ў руках дзіцячых нашых столькі
Трапнасці і цвёрдасці было,
Што ад здымка заставаўся толькі
Клок валосся, спушчаны на лоб...
Пазгнілі ўжо недзе ўсе рагаткі,
Прэе смецце ў касках чужаніц.
Нам краіна уручыла скаткі,
Аўтаматы і спакой граніц.
І «стральба» з рагатак сном здаецца,
Ды неўпрыцем на вучэбны пляц
Мы прыносім боль тых дзён на сэрцы—
І ў «дзесятку» кулі ўсе ляцяць.

Вішанька

Юная вішанька тонкая
Поруч з разгалістай грушынай.
Голая чорная кронка
Дробным сняжком зацярушана.
Тут, раўнадушны, раз тысячу
Бегаў я раніцай кожнаю.
Сёння-ж на ганак ледзь выскачыў—
Так і замёр, заварожаны.
Ранняя цеплынь вясенняя
Гэткім прыгожым зрабіла ўсё:
Нібы фатою вясельнаю,
Вішанька цветам акрылася.
Стала ля грушыны стройнаю,
Белаю, чыстаю, юнаю,
З горда узнятаю кронаю—
Гордаю прыгажуняю...
...Вось і з табою—столькі
Разам жылі і сталелі,
А разглядзеў цябе толькі
Я на чужым вяселлі.

СКУЛЬПТУРА

Ці расцвітуць ля ног жывыя кветкі,
Ці перад ёй блісне шкло ільдзін,—
Яна ўсё гэтак-жа стаіць з ракеткай
І ўдалячынь з усмешкаю глядзіць.
Хай ля яе аб нечым плачуць людзі,
Хай аб каханні ля яе ілгуць,—
Ёй не ўздымае хваляванне грудзі,
І усмешка не сыходзіць з белых губ.
Прыгожая скульптура нежывая,
Ёй ўсё роўна: холад ці агонь...
А часам людзі гэткімі-ж бываюць—
Сляпымі і глухімі да ўсяго.

Педагог

НА ЗДЫМКУ: выхаванцы дзіцячага дома ў час экскурсіі ў Ленінградзе. 1950 год.

Не хаваючы радасці, ён стаяў на сцэне і слухаў, як усе хвалілі яго за цікавую гутарку. Але раптам з першага раду ўзнялася Зіна Румянцава.

— Ад комсамольскай арганізацыі прапаную за добра падрыхтаваную гутарку аб'явіць Карабанаву падзяку і выгнаць з дзіцячага дома!

Гэта было так нечакана, што ў першы момант усе замерлі. Але раптам зала выбухнула.

— Як выгнаць? За што?—імкнучыся перакрычаць усіх, грымеў сябра Уладзіміра Міхаіл Гатальскі.

— За хамскія адносіны да дзяўчат, вось за што! —цвёрда адказала Зіна. Тут-жа аб'явілі адкрыты комсамольскі сход. Мабыць, ён быў самым бурным у гісторыі дзіцячага дома. Апошняе слова на ім далі Карабанаву. Нервова комкаючы канспект гутаркі, ён стаяў на сцэне, не знаходзячы сілы адарваць ад падлогі вочы.

— Рэбяты! Зразумейце, я... я, як вам сказаць?.. Рабіце са мной, што хочаце, але не ганіце з дзетдома. Паверце, гэтага больш ніколі не будзе,—заікаючыся ад хвалявання, прашаптаў ён.

Зачыталі пастанову: «Аб'явіць Уладзіміру Карабанаву строгую вымову з апошнім папярэджаннем. З дзіцячага дома не выганяць».

А літаральна праз некалькі дзён на такім-жа адкрытым комсамольскім сходзе яму была аб'яўлена падзяка. І вось як гэта было.

У суседняй вёсцы загарэлася хата. Чырвоныя языкі полымя ўжо лізалі сцены і страху. А тушыць не было каму: усе былі на рабоце ў полі. Першымі да месца пажара прыбеглі выхаванцы, прыцягнулі насос, адшукалі вёдры, багры.

— Давай-давай!—крыкнуў Казмірчук хлопцам каля насоса. Праз момант магутны струмень вады шугануў на сцяну. І раптам з ахопленай полымем хаты пачуўся дзіцячы плач. Закутаўшы твар курткай, Карабанаў першым кінуўся да акна, за ім Бязлюдаў, Дзюба. Раздаўся трэск і, выкінуўшы ў неба сноп іскраў, рухнуў дах. Прайшла адна секунда, другая... А рэбят ўсё не было. Але раптам з другога боку дома выскачыў з дыму з хлапчуком на руках Бязлюдаў, за ім прыгнуўшыся бег Карабанаў. Да сваіх грудзей ён прыціскаў русавалосую дзяўчынку. Маці, ахопленая слязамі радасці, кінулася да яго. Дзед, які стаяў поруч, крануў асцярожна свайго суседа і, паказаўшы на Карабанава, сказаў:

— Глядзі, гэта-ж той хлопец, які некалі ў Нічыпара гарбузы цягаў з гароду.

Так, гэта быў ён і не ён. Былы злодзей Уладзімір Карабанаў, закончыўшы на «выдатна» сем класаў, паступаў у Ленінградскі суднабудаўнічы тэхнікум.

Неяк зімой Захар Ошэравіч атрымаў ад дырэктара тэхнікума пісьмо. У ім ён дзякаваў педкалектыў дзіцячага дома за добрае выхаванне Карабанава. За яго лёс Захар Ошэравіч мог ужо не хваляваца. І аб гэтым ён упэўнена заявіў у Маскве, з трыбуны Усесаюзных педагагічных чытанняў.

Рэгламент канчаўся, а яго ўсё прасілі расказваць. З усіх бакоў сыпаліся пытанні. Іх задавалі настаўнікі, дэрэктары дзіцячых дамоў, прафесары педагагічных навук. У перапынку паміж пасяджэннямі да Захара Ошэравіча падыйшла жонка вялікага педагога Макаранкі.

— Ад усяго сэрца віншую вас, жадаю ў далейшым такіх-жа поспехаў!

Чытач можа запытаецца, а дзе Карабанаў зараз. У гэтыя дні ва Уладзіміра таксама ў разгары сесія. Паспяхова закончыўшы тэхнікум, ён без уступных экзаменаў быў прыняты ў інстытут воднага транспарту. Днямі Захар Ошэравіч атрымаў ад яго пісьмо. Піша, што летам разам з сябрамі-трэцекурснікамі працаваў на цаліне ў Кустанайскай вобласці...

Бадай няма такога кутка нашай неабсяжнай Радзімы, дзе-б не працавалі былыя пітомцы Захара Ошэравіча. У Хабараўскім краі будуюць новы завод Марыя Анікеева і Лена Крыжаноўская. Паспяхова закончыўшы Пінскае педвучылішча, дзяўчаты першымі адгукнуліся на заклік партыі аб асваенні невычарпальных багацця ў Далёкага Усходу. На поўначы водзіць караблі малады штурман Эдуард Бязлюдаў. Дзесьці ў гарах Каўказа працуе нястомны геолаг Міхаіл Фірсаў.

Нядаўна Міністэрства асветы выдала зборнік «З вопыта дзіцячых дамоў». Там ёсць і артыкул Захара Ошэравіча.

Зараз у яго запаветная мара: пасля заканчэння універсітэта сабраць зноў сваю былую «гвардыю», так жартам называе ён сваіх выхаванцаў-педагогаў, і разам з імі выхоўваць новае пакаленне.

Н. СОКАЛАЎ.

Адрас рэдакцыі: Мінск, Універсітэцкі гарадок, Біякорпус, 62, тэл. 2-07-19 Рэдактар А. ВОЛК.

АТ 10534 Друкарня выдавецтва БДУ. Зак. 110 Тыраж 2000